Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 20 Вільня, Нядзеля 22 Траўня 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Што нас дзеліць?

Па ліквідацыі „Грамады" некаторыя з яе павадыроў палітычную орыентацыю савецкую зьмянілі на польскую. Стварылі яны з некалькіх асоб палітычную групу — так званую беларускую санацыю ці лепш — кірунак беларуска-польскай угоды.

Беларускі незалежны палітычна-грамадзкі кірунак, у склад якога ўваходзяць БХД, Сялянскі Саюз і Беларускае Праваслаўнае Аб'яднаньне, да гэтай групы ўгадовай адвёсься опозыцыйна і крытычна, так як і да самога ўраду. Між гэтымі групамі пачалася часта дужа вострая барацьба на газэтных балонках, сутнасьць якой часта ня кожны разумее, або разумее яе дужа пасвойму.

Мы ўважаем, што кожны народ, асабліва жывучы ў чужой дзяржаве, мусіць мець розныя палітычныя кірункі, якія рознымі дарогамі, але да аднэй імкнуцца мэты — да поўнага адраджэньня і вызваленьня народу і якія ўзаемнай ідэовай барацьбой шляхі гэныя высьвятляюць, здабываюць для народу належныя правы ў данай дзяржаве і гадуюць адпаведна народ да здабыцьця апошніх яговых ідэалаў.

У ліку гэткіх розных палітычных і грамадзкіх кірункаў у кожным народзе звычайна бывае дый мусіць быць кірунак больш ці менш настроены да ўраду ўгадова, кірунак звычайна ня надта ўдзячны і ня надта прыемны. Мэта такога кірунку — бараніць прад урадам правы свайго народу і здабываць для яго ўсё тое, што гэтаму народу, нараўні з усімі грамадзянамі ў дзяржаве, належыцца. Аднак гэткая палітычная група мае права і нават абавязак існаваць у пэўных толькі граніцах і пры пэўных толькі варунках; гэта знача — пакуль гэткая група ўгодай сваей сапраўды дае народу рэальныя вынікі і пакуль дзеіць у граніцах, у якіх яна ня шкодзіць народнай справе і існуе ня коштам гэтай справы. Калі-ж для якой угадовай палітычнай групы ўспомненых варункаў няма, яна ў пару павінна спыніць сваю працу і або адысьці на бок, або пашукаць сабе іншых дарог, сапраўды рэальных і ідэйных для барацьбы за вызваленьне народу.

Вось-жа з угодай беларускай іменна далёка ня ўсё тут у парадку. Прадусім яна праз некалькі гадоў свайго існаваньня нічога ад ураду для беларускага народу не здабыла, ды горш таго — пры ёй ліквідуюцца рэшткі беларускага школьніцтва, якое пачалося бяз угоды і пэўне-ж без яе існавала-б, ці ліквідавалася-б, ня горш, як пры ёй.

Узноў-жа сымпатыі свае ў польскага ўраду, няведама дзеля чаго, беларуская ўгода здабывае коштам беларускіх і незалежных ад ураду груп, коштам нават беларускага народу. Яна вядзе безаглядную, пераважна ілжывую атаку — пэўне-ж дзеля дагаджэньня ўраду — на беларускія опозыцыйныя арганізацыі ня толькі палітычныя, аб'яднаныя ў Бел.Нац.Камітэт, але так-жа на культурныя і эканамічныя, як Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны. Дзеля тэй-жа мэты яна проста з праступнай сьмеласьцяй карыстаецца Віленскай Беларускай Гімназіяй, якая становіць галоўную апору ўсей угадовай яе палітыкі і якая сяньня бадай адна ўваходзіць у склад палітычнай экспозытуры беларускай угоды так зв. „Цэнтрасаюзу". Гэткая палітыка адбываецца сапраўды коштам беларускай народнай душы, бо дзякуючы гэтай палітыцы калечыцца маладая душа беларуская і падрываецца да гімназіі ў народзе давер і павага.

Для тых-жа безузаемных сымпатыяў прад урадам беларуская ўгода закладае ультраўгадовую, пазбаўленую ўсякай народнай ідэолёгіі, студэнскую арганізацыю „Скарынія", якая, як відаць з дасюлешняй яе дзейнасьці, мае за заданьне апанаваць усё беларускае студэнства, арганізаванае ў свой асобны Студэнскі Саюз у Вільні.

Беларуская ўрэшце ўгода сваей працай дэорганізуе і дэморалізуе здаровую беларускую палітычную думку і агулам беларускі народ. Яна, жадаючы пакрыць праўдзівы твар свой, сваю безнадзейную любоў да польскага ўраду, заве сваю ўгадовую акцыю акцыяй адзіна народнай, незалежніцкай і сапраўды толькі вядучай да мэты. У выніку гэтай яе працы народ беларускі замест гадавацца палітычна на моцных ідэовых і глыбока этычных падставах, сапраўды псуецца і аслабевае, бо вучыцца прымаць фальш за праўду, суррагат за ідэал праўдзівы, або пазнаўшы ўсю ўнутраную ману і пустату гэткай палітыкі, апускае рукі ды нават пераходзіць у варожы лагер. Урад-жа звычайна на такую палітыку глядзіць прыхільна,бо надта танным коштам, беларускімі-ж рукамі, аслабляецца апазыцыйны да ўраду народны беларускі рух.

З гэтага ўсяго,толькі з-большага закранутага, бачым, што варункаў і граніц, у якіх можа мець месца кожная ўгода, беларуская ўгода ня мае і дзейнасьць яе ўжо яўна перайшла тыя граніцы, у якіх з этычнага, грамадзкага і беларуска-народнага пункту гледжаньня было-б можна ёй дзеіць.

Ня гледзячы аднак на гэта беларуская ўгода з упорыстасьцяй годнай лепшай справы безнадзейна трывае на сваім, ня маючым ніякага апраўданьня, становішчы. Праўда, уся гэтая справа з боку псыхолёгічнага павадыроў яе і бадай эдзіных сяброў (Луцкевіч і Астроўскі) тлумачыцца проста. Гэта людзі, якія з натуры зьяўляюцца опортуністамі, якія з лёгкасьцяй і з спрытам акробатаў скачаць ад выпадкаў да выпадкаў і для якіх праца ідэйная на падставах хоць крыху ідэолёгічных цалком незразумелая. Да таго-ж хворая амбіцыя А. Луцкевіча ніколі яму не пазваляе прызнацца да зробленага глупства; найвыжэй у гэткіх выпадках, якіх поўнае жыцьцё ягонае, патраціць ён свае памылкі, свае палітычныя банкроцтвы, яўна разьмінаючыся з праўдай, узлажыць на свайго палітычнага праціўніка, як гэта ён робіць з намі стала і як зрабіў з паслом Ярэмічам, які мусіў шукаць справядлівасьці ад клявяты ягонага „Бел. Звону" аж у Судзе Маршалка Сойму, дзе справядлівасьць гэну, на вялікую ганьбу „нашым" угадоўцам, знашоў сапраўды.

Аднак гэта псыхолёгічнае зразуменьне няўдачных беларускіх байцоў за ўгоду з польскім урадам, не дае нам яшчэ права маўчаць аб гэтым, а наадварот — наша разуменьне гэтага ў імя агульнага дабра ўскладае на нас абавязак шырока гэта тлумачыць грамадзянству і народу.

Калі мае быць ўгода, дык мусіць быць сапраўды этычнай і карыснай народу. Калі-ж гэтага няма — яна мусіць спыніць сваё існаваньне. Беларуская угода, як гэта ўсе добра бачаць, ня мае ніякага апраўданьня на сваё гэткае існаваньне, якім яно ёсьць сяньня.

Гэткі наш пагляд і пагляд гэты розьніць нас істотна ад пачынаньняў Луцкевіча і Астроўскага. І дзеля гэтага ня можа быць мовы ані аб спыненьні ідэйнай нашай барацьбы з угодай, ані аб нейкім з ёй аб'яднаньні, бо адно і другое вядзе дарогай да поўнай ліквідацыі апошніх сапраўды беларускіх незалежных ідэйных асяродкаў.

З газэт.

Несьвядомасьць ці злая воля?

12 г. м. меўся адбыцца Агульны Сход Т-ва Беларускай Школы ў Вільні. Адміністрацыйныя польскія ўлады аднак не далі на гэта дазволу і, сьледам за іншымі, зачынілі гурток ТБШ ў Вільні на Новым Сьвеце. Таго-ж самага дня 12 г. м. нейкім безадказным сілам уздумалася рабіць нейкую „дэмонстрацыю" на вуліцах Вільні. Сабраўшы ўсе гэтыя факты, а йшчэ незраўнана больш іх навыдумываўшы, ведамы з свайго беларусажэрства „Dziennik Wileński" ў № 108 перамяшаў гарох з капустай і за ўсё ліха зрабіў адказным Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

І чаго толькі тут „Dz. Wil." не начоўп? — Возьмем папарадку і толькі найважнейшае. Вось-жа „Dz. Wil." цьвердзіць, што: 1. у Вільні на Новым Сьвеце быў зачынены гурток Інстытуту, 2. што Інстытут і ТБШ — гэта бадай адно і тое самае, а іхным органам ёсьць „Бел. Крыніца", 3. што Гурткі Інстытуту зьяўляюцца экспозытурамі камсамолу, маюць шмат грошай, якія дастаюць з Менску, што 4. „Бел. Крыніца" „дарма" раздзяляе нейкія бібліятэкі, якія „нармальным шляхам улады маглі-б сканфіскаваць" і г. д. і г. д., што раз, то заядлейшым тонам цкуючы на Б. Інстытут Г. і К. як сваіх няшчасна-„набожных" чытачоў, так і паліцыйныя ўлады.

Не без значэньня пры гэтым ёсьць факт, што пісакі „Dz. Wil." так залгаліся, што пачалі пярэчыць самі сабе(!) А калі ім было прыпомнена аб гэтым, дык з лёгкім сэрцам **памінулі ўсё істотнае**, адгаварыліся „памылкай" і, перавярнуўшы ката хвастом наперад, зрабілі гэтым разам ужо Б. Інстытут Г. і К. органам „Беларускай Крыніцы" (перш было наадварот). Гэта называецца мусіць „папольску" сумленнай журналістыкай? — Палюдзку-ж бяручы справу дык гэта простае ашуканства!

А дзеля таго, што несьвядомасьці ў так элемэнтарных праўдах у рэдактароў „Dz. Wil." усё-ж дапусьціць трудна, астаецца альтэрнатыва другая — злая, але здэцыдаваная воля шкодзіць беларускасьці на кожным кроку: проці людзкой дурнаты сягоньня ўсякая мэдыцына йшчэ бязсільная і ніякая аптэка ня мае лякарства.

Пакідаючы гэтым разам на старане справу, як Б. Інстытут Г. і К. захоча зарэагаваць на відавочны паклёп, мы за сябе адзначым толькі, што ўважаем за свой нацыянальны абавязак об'ектыўна інформаваць нашых чытачоў аб усім беларускім жыцьці, ня выключаючы з гэтага і Т-ва Б. Ш., прынамся да часу, пакуль яно ня мае свайго ўласнага прэсавага органу.

р.

Мала прачытаць газэту самому:
т р э б а
яе прачытаць сабраным суседзям разам!

Аднаго тут у гэтай барацьбе астаецца толькі пажадаць, каб яна была па магчымасьці культурная, ідэйная і каб апіралася на праўдзе і на шчырым пракананьні. Вось-жа, праводзячы нашу грамадзкую і палітычную працу, мы заўсёды гэтак паступалі і гэтак думаем паступаць надалей.

З беларускага жыцьця.

А. Язэп Гэрмановіч выехаў. У мінулую суботу 14 г. м. а гадз. 7 рана выехаў праз Вільню—Баранавічы—Стоўпцы—Менск—Маскву—Сібір на місію ў Харбін (Манджурыя) а. Язэп Гэрмановіч, беларус, законьнік з кляштару а.а. Марыянаў у Друі, Браслаўскага пав.

Пры сучасным голадзе на сапраўдныя беларускія інтэлігенскія сілы, выезд заграніцу Бацькаўшчыны кожнае такое дзейнае сілы ёсьць вялікай стратай, а тымбольш выезд чалавека такой меры, як а. Яз. Гэрмановіч. Страта гэта вялікая, але меймa надзею, што ня вечная. Усё сьведамае беларускае грамадзянства праводзіць думкамі а. Гэрмановіча да мэты ягонай падарожы (Харбін), куды ён маніцца даехаць у панядзелак 23 г. м., жадае яму здароўя і хуткага павароту на Бацькаўшчыну.

А. Яз. Гэрмановіч — слабы на здароўі і з ім, для помачы ў дарозе, выехаў іншы законьнік таго-ж кляштару.

З жыцьця праваслаўных беларусаў. Ужо некалькі гадоў праваслаўныя беларусы дамагаюцца ад царкоўных уладаў слова Божага ў роднай беларускай мове. Царкоўныя ўлады прынцыпова згадзіліся, што і Беларусам ёсьць мейсца ў праваслаўнай Царкве і дзеля таго сьвяшчэньнікам можна гаварыць пропаведзі і навучаць верных рэлігіі ў беларускай мове. Але гэта толькі прынцып Царквы, а ня згода польскіх уладаў Царквы. Царкоўныя ўлады аўтокефальнай Царквы ў Польшчы сваім паступаньнем у адносінах да Беларусаў стаяць на тым становішчы, каб беларускай мовы ў праваслаўную Царкву, абслугоўваючую беларускае насельніцтва, ня ўпусьціць. Аб гэтым сьведчыць вось і гэты, адзін з многіх, найнавейшы факт.

Апошнімі часамі Віленскі архіепіскап Хвядос назначыў сьвяшчэньнікам у царкву сьв. Мікалая ў Вільні беларуса а. Ал. Каўша, які меў здаваляць патрэбы Віленскіх праваслаўных беларусаў, навучаючы іх словам Божым пабеларуску. Даведаліся аб гэтым віленскія праваслаўныя расейцы, даведаліся і беларусы. Расейцы адразу пачалі рабіць усё, каб сьвяшчэньніка беларуса ў царкву сьв. Мікалая ня ўпусьціць і гэтым перашкодзіць увядзеньню ў гэтую-ж царкву беларускай мовы, а беларусы чакалі таго сьвяточнага дня, калі адбудзецца першая Служба Божая для праваслаўных беларусаў м. Вільні і гэтай урачыстасьцяй пачнецца сярод Віленскіх беларусаў душпастырская праца пабеларуску.

Першая Служба Божая для беларусаў у Царкве сьв. Мікалая мела адбыцца ў нядзелю 15 г. м. На набажэнства набралася шмат народу. Але, на зьдзіўленьне прысутных, падчас Службы Божай пропаведзь пачалася парасейску. Абураныя беларусы дэмонстрацыйна вышлі з царквы, у якой асталося 15—18 асоб. Пасьля выхаду з царквы цікавейшыя даведаліся, што арх. Хвядос у апошні дзень прад першай Службай Божай для беларусаў адмяніў сваю пастанову і адклікаў з царквы сьв. Мікалая а. Каўша.

Дык вось як „прыхільна“ адносяцца расейскія праваслаўныя іерархі да беларусаў.

На наш пагляд, віленскія праваслаўныя беларусы на пасыўным байкоце пропаведзяў парасейску спыняцца не павінны, а павінны адначасна дамагацца сваіх правоў у жыцьці рэлігійным больш актыўна, шляхам легальных выступленьняў прад адпаведнымі царкоўнымі ўладамі.

Таварыства Беларускай Школы. Т-ва Бел. Школы існуе на нашых землях больш 10-х гадоў.

Характар Т-ва Б. Ш. — культурна-прасьветны. Апошнімі гадамі, калі з радыкальнай „Грамады“ выявяліся „найвышэйшыя“ па форме ўгадоўцы: Антон Луцкевіч, Р. Астроўскі і Ф. Акінчыц ды стварылі свой „Цэнтрасаюз“, Т-ва Бел. Школы пачало перажываць розныя няўзгоды.

Пасьля заснаваньня „новае“ угоды, Т.Б.Ш. ня можа нават наладзіць нармальнага парадку ў сваім Цэнтры — выбраць, як гэтага вымагае статут, цэнтральныя ўлады Таварыства. Апошнімі днямі гэты нялад паўтарыўся яшчэ раз.

На 12 красавіка с. г. быў назначаны Агульны Сход Т-ва, але адміністрацыйныя ўлады яго забаранілі, абяцаючы адначасна даць дазвол на пазьней. Паноўна Агульны Сход Т.Б.Ш. быў вызначаны на 12 г. м. Але і гэты сход не адбыўся — адміністрацыйныя ўлады таксама не пазволілі.

Польскія і расейскія газэты пісалі ў гэтай справе розна. Адны прышпілялі да Т.Б.Ш. камуністычныя знакі, а іншыя пісалі, што адміністрацыйная ўлада забараніла агульнаму сходу Т.Б.Ш. сабрацца на нарады з прычын фармальных самога Т-ва, бо быццам прыбылі на агульны сход дэлегаты з запросінамі цэнтралі, а не з дэлегацыйнымі дакумантамі з мясцоў.

Але мы даведваемся, што ня зусім так яно ёсьць, як падалі польскія і расейскія газэты. Дэлегаты на агульны сход Т.Б.Ш. выдэлегаваны былі паветавымі сходамі, якія адбыліся прад гэтым у Беластоку, Косаве і іншых мясцох, а так-жа сходамі гурткоў у паветах: Пружанскім, Слонімскім і Навагрудзкім. Словам, сутнасьці ўсяе гэтае справы трэба шукаць у іншым мейсцы. Але ня ў тым справа. Нас цікавіць прадусім праца Т.Б.Ш.

Вось-жа ў гэтай справе мы распытываліся ў дэлегатаў прыбыўшых на сход Т.Б.Ш. Ад іх мы даведваемся, што некаторыя гурткі Т.Б.Ш. даволі інтэнсыўна працуюць. Перашкод у беларускай культурна-прасьветнай працы поўна. Правакацыям цёмных сіл і граніц няма. Найбольш відавочная правакацыя— гэта нелегальныя камуністычныя праклямацыі, якія вельмі часта, як сьмяцьцё, валяюцца па вуліцах вёсак. Праклямацыямі гэтымі ніхто ў вёсцы ня цікавіцца і нічога ў гэтых праклямацыях разумнага ня вычытаеш. Заўсёды пішацца ў іх адно: абрыдлая лаянка ды пахвала Саветаў.

Пасьля паяўленьня такіх праклямацыяў, як ведама, зьяўляецца ў вёску паліцыя і пачынаецца сьледзтва, часта рэвізіі і арышты.

У такім вось палажэньні знаходзіцца цяпер культурна-прасьветная беларуская арганізацыя Т-ва Беларускай Школы.

Закрыцьцё гуртка Т-ва Бел. Школы ў Вільні. Дня 12 г. м. адміністрацыйныя ўлады зачынілі гурток Т-ва Беларускае Школы ў Вільні на Новым Сьвеце.

З выдавецкае нівы. Вышаў з друку № 5 беларускага каталіцкага месячніка „Chryścijanskaja Dumka“ (рэдактар — Кс. А. Станкевіч), які абымае шмат навучальнага матэрыялу і багатую як беларускую, так заграгічную кроніку. Цана нумару 20 гр.

Вышлі таксама з друку (на правох рукапісу): лістоўка „Што такое Увія,“ напісаная Беларусам Б., а так-жа „Božaja Chwała“, малітаўнік законьнікаў аа. Марыянаў (палацінску і пабеларуску).

У Дзьвінску (сяньняшняя Латвія) вышла з друку сцэнічная п'еса ў 3-х актах, з сьпевамі, п. н. „Птушка на волі.“ Кніжыцу гэту напісаў О. Сахараў.

„Наш Голас“ — аднадзёўка, Вільня, май 1932 г. Ёсьць гэта яшчэ адна порцыя да бязслаўнай „монографіі“ аб Ант. Луцкевічу, напісаная ягоным даняладўняшнім кумпаном Ф. Акінчыцам. — Цана аднадзёўкі 50 гр.

— Усе беларускія — і небеларускія, але аб Беларусі — выданьні можна дастаць у беларускай кнігарні „Pahonia“ Wilnia, Zawalnaja wul. № 6—10.

W. A.

Kaniok - Harbuniok.

ČAŚĆ III.

I.

Jedzie, jedzie naš Iwan
Na daloki akijan;
Reki, woziery hłyboki,
Hory strašnyja, wysoki
Pralacieli, jak strałoju,
Nie datknuŭšysia nahoju.
Tak, złamaŭšy pieraškody,
Biaz nijakaje pryhody,
Až da mora pryjažđžajuć.
Kryšku tut adpačywajuć;
Jechać dalej chočuć skora.
Ažno bačuć — niejka mora —
Nowa strašna pieraškoda:
Wializarna, jak kaloda!
Ahramadnaja rybišča.
Źwier—nia źwier?a nosam świšča;
Sam lažyć, jak-by znarok,
Sierad mora papiarok.
Heta rybina strašenna
Ad usich była admienna:
Čuda-juda ryba — Kit,
Skura ćwiorda jak hranit;
A pad skuraj sała, sała!
Na piać tysiač ludziej stała.
Noh nia maje, ruk nia maje;
Karabli chwastom łamaje.
Na baku ciapier lažyć,
Ciažka stohnie, až hrymić.
Pa kicie, jak-by ničoha,
14) Idzie hładkaja daroha;
Na bakoch pala, łuhi...
Kładuć siena u stahi;
Ludzi ščyraña pracujuć:
To aruć, to baranujuć.
Kit byŭ wielmi pakarany:
Baki dobra paarany;
Niejki ludzi pa im chodziać,
Pamiž rebraŭ płot harodziać.
Na chwaście wialika pušča —
Dub stary, sasna dramušča;
Bor kałyšycca, šumić.
Na chrybcie siało staić:
Chaty wielmi pastareŭšy,
To padhniŭšy, to asieŭšy.
Dzieci ŭ koniki hulajuć;
Ludziej baby abmaŭlajuć.
Mužyki na hubie siejuć;
Miž zubami zbožža wiejuć,
A na łebie bob małociać.
Miž wačami dzieci psociać;
Ražnom dłubajuć u wuchu,
Pałkaj šłopajuć pa bruchu.
Kit praz hetuju fatyhu
Čuć nia źjeździŭ až „u Ryhu."

II.

Na kita Kaniok ŭskrabaŭsia;
Ad chwasta jak razahnaŭsia,
Dyk wichrom, małankaj niośsia,
Ažno Janka na im trośsia.
Bje kapytami ab kości —
Tak, z razhonu, nie pa złości —
Ažno kitu ciažka stała,
Tak zaliŭ jamu za sała!
Kit sapie i uzdychaje,
Pośle Janku zapytaje:
„Skul niasieć Boh? i kudy?"
Janka kaža: „My tudy,
Hdzie nichto z ziamli nia chodzić,
Tam, hdzie tolki miesiac brodzić:
U niabiesna jedziem carstwa,
Tam, hdzie sonca haspadarstwa;
A wiazłom pakłon carycy
Da niabiesnaje śwatlicy..."
„Ach, bratočki maje miły!"
Kit kryčyć im z całaj siły:
„Zapytajciesia łaskawa,
Jak tam budzie maja sprawa:
Ci mnie doŭha tut lažać?
I kali mianie taptać
Pierastanuć ludzi hety?
Bo lažu tut doŭhi lety.
Ŭsie baki maje pasochšy,
Ja aślepšy i ahłochšy,
Haława maja prykuta...
Kali skončycca pakuta?"
„Dobra, dobra! zapytajem;
Času, praŭda, mała majem."
„Adslužu wam, maje miły!
Kit kryčyć im z całaj siły.
Dobra!
Jeduć dalej jany śpiešna.
Było Janku kryšku śmiešna:
Čym kit moža adslužyć,
Kali sam jak pień lažyć?
Jon adnak nia źmiarkawaŭsia,
Dyj daremna padśmiajaŭsia,
Bo na świecie ŭsiak bywaje:
Časam worah pamahaje;
A, jak lwu pryšłosia ciažka,
Pamahła jamu muraška...
Zrešta dalej budziem bačyć,
Što kitowa słowa značyć.

III.

Baśnia skorańka placiecca —
Dzieła chutka nie dajecca.
Pierajechaŭ naš Iwan
Pa kicie praz akijan.
Nos kitowy jak minuli,
Čuć-čuć tam nie zatanuli.
Jość bałota tam takoje —
I hłyboka i hniłoje...
Tolki ščaściem acaleli
Z tej praklataje kupieli.
Ciapier dalej jechać treba
Z taho bierahu da nieba.
Až tam sonìejka światlejša
I ziamielka pryhažejša:
Rastuć palmy, cynamony,
Ananasy, andrymony;
Pirahi rastuć na poli..'
I nia pomniu, što tam bolej!
Čaho chočycca tabie —
Rastuć duli na wiarbie.
Tyja-ž ludzi ptušak dojać
I worony dzietak sojać...
Woś dajechali tudy,
Hdzie kaniec ziamli, wady.
Až tam bačać — toj paroju
Nieba schodzicca z ziamloju!
Chmary chodziać wiemli nizka,
Da ziamielki nadta blizka:
Baby woŭnu jak praduć,
Wieraciony tam kładuć.
A jak chmary nasiadajuć,
Dyk tahdy ich padpirajuć —
Chto čym moža, choć rukoju,
A najlepiej—kačarhoju.
U patrebie tož časami
Prahaniajuć ich bičami.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ

У Незалежнай Літве беларусаў хоць ня шмат, але пачалі яны ўжо там арганізавацца: маюць сваё культурна-прасьветнае Т-ва, якое рупіцца аб патрэбах усіх беларусаў. Дзякуючы захадам гэтага т-ва, у нядзелю 1 траўня ў Коўне адчрыты Народны дом пад назовам „Беларуская Хата", дзе беларусы змогуць адбываць сабраньні, ладзіць прадстаўленьні і арганізаваць бібліятэку. З нагоды адкрыцьця „Бел. Хаты" была прачытана лекцыя аб беларускім жыцьці ў Саветах і Польшчы. Прэлегент сьцьвердзіў, што ня гледзячы на вялікія труднасьці беларускага народнага жыцьця, усюды яно расьце і разьвіваецца

З Польшчы.

Чуткі аб новым курсе палітыкі. Ужо некалькі тыдняў ходзяць чуткі аб зьмене ў Польшчы ўраду. Калі пачаліся г. зв. конфэрэнцыі б.прэм'ераў пасьля траўнявага пэрыяду — уся польская прэса загула аб зьменах польскай нутранай палітыкі. Такім чынам вытварылася цяпер у Польшчы атмосфэра фактычнага палітычнага крызысу. Ды і нічога дзіўнага. Гаспадарчае і палітычнае палажэньне Польшчы вымагае новых натугаў народу і эканоміі, каб утрымаць дасюлешняе палітычнае палажэньне і сілу гаспадарчую Польшчы.

Дасьледчы Інстытут гаспадарчай коньюнктуры ў сваей справаздачы за першую чверць сёл. году цьвердзіць, што „стан грашовага рынку не папраўіўся" і „зьніжковая тэндэнцыя трывае далей."

З прычыны апошніх выбараў у Францыі, якія прачысьцілі дарогу да ўлады лявіцы, рашуча праціўнай сучаснаму ладу ў Польшчы, ствараецца так-жа атмасфэра крызысу польскай і нутранай палітыкі.

Пры шуканьні шляхоў аздараўленьня гаспадарчага і палітычнага, пачаліся г. зв. конфэрэнцыі б. прэм'ераў пасьля траўнёвага пэрыяду; пастаноўлена падвышка аплатаў за заграпічныя пашпарты, злучэньне двух міністэрстваў у адно і нават ліквідацыя міністэрскага рэсорту.

Апошнімі часамі Рада міністраў пастанавіла зьліквідаваць міністэрства працы, а мін. земляробства і мін. зямельнай рэформы злучыць у адно.

Б. паліцэйскі фальшаваў грошы. У Варшаве знашлі вялікую тайную фабрыку фальшывых грошай. Гэтай фабрыкай кіраваў б. паліцэйскі „шподовнік" Бромбэрг, які меў каля 100 чалавек супольнікаў у гэтай фабрыцы. Фабрыка выпусьціла некалькі сот тысяч штук 5 і 2 залатовак. Грошы гэтай фабрыкі добра зьвіняць, дык можна пазнаць іх толькі пры помачы важаньня.

З заграніцы.

Крывавы тэрор у Японіі. Дня 15 г. м. ў Токіо забіты японскі прэм'ер міністраў Інукаі. Забойства адбылося гэткім спосабам: у кватэру прэм'ера прышло 7 асоб, адзетых у афіцэрскую адзежу і пачалі страляць з рэвальвэраў у прэм'ера. Моцна ранены прэм'ер скора памёр.

Аднача́сна былі кінуты бомбы ў Японскі Банк, на цэнтралю паліцыі, на галоўны сэкрэтарыят партыі Сэюкаі, на банк Мітсу Біш і на кватэру міністра заграпічных спраў. Пасьля гэтых нападаў 18 асоб самі зьявіліся ў паліцыю і заявілі, што яны прышлі як вязьні, каторыя даканалі гэтых нападаў.

Усе яны належаць да арганізацыі „Чорны Смок", або інакш — „Мёртвая рука", якая змагаецца з японскай палітыкай у Манджурыі і Шанхаю. У гэтым нападзе забіта 7 паліцэйскіх і 3 асобы ранена. Падчас нападу былі раскінены праклямацыі, у якіх выяўляюць тэрорысты свой спраціў проціў сучаснай японскай палітыкі і аднача́сна падаюць кліч „Няхай жыве цар!".

Праклямацыі гэтыя падпісаны саюзам маладых афіцэраў японскага войска.

Японская армія абвесьціла ультіматум, дамагаючыся стварэньня народнага ўраду.

Перарыў нарадаў Камісіі разаружэньня. Нядаўна пачаўшая радзіць над справай сусьветнага разаружэньня камісія спыніла свае нарады ўзноў. Выдатныя палітыкі гэтай камісіі разьехаліся дамоў, а над разаружэньнем асталіся радзіць толькі экспэрты, якія стараюцца пагадзіць імпэт вялікадзяржаўніцкіх імкненьняў з вялікай справай агульнага разаружэньня.

Перарыў нарадаў гэтай камісіі наступіў у зьвязку з няяснасьцяй францускай палітыкі якая, мусіць зьмяніцца пасьля парлямэнтарных выбараў.

Кангрэс нацыянальных меншасьцяў сёлета адбудзецца ў Вене (Аўстрыя) у другой палове чэрвеня с. г.

VI-ты усяйны кангрэс у Вэлеградзе (Чэхаславаччына) адбудзецца сёлета ў міжчасе ад 13 да 17 чэрвеня.

З Вільні.

Другі напад на Беларускую друкарню ім. Фр. Скарыны. У мінулую нядзелю 15 г. м. вечарам „невядомыя" прайдзісьветы, карыстаючы з сьвяточнай (каталіцкая Сёмуха) нячыннасьці беларускай друкарні ім. Фр. Скарыны, што месьціцца ў Вільні пры Завальнай вул. № 6—10, выламалі ў ёй дзьверы і ўварваўшыся ў памешканьне, парасопалі па падлозе шрыфт (літары), прычыняючы такім чынам друкарні вялікую шкоду матэр'яльную.

Хто зрабіў гэты бандыцкі напад? — Не ўзяўшы за руку — кажуць — нельга называць па іменьню. Аднак ёсьць пэўныя знакі, каторымі нельга не падзяліцца.

„Бел. Звон" ў апошнім (14) нумары востра напаў на друкарню, не astanaўляючыся нават прад сфальшаваным даносам аб „значных зысках..." Далей даведваемся, што каля тагосамага часу, дагэтуль „нязлоўленыя" шкоднікі безрэзультатна, але небязсьледна прабавалі быццам выламаць дзьверы і ў памешканьне Беларускага Студэнскага Саюзу; а што найцікавей, што гэта спроба ўзламаньня дзьвярэй у памешканьне Бэл. Студ. Саюзу мела быць робленай з суседняга пакоіку, у якім прыпыняецца „ведамая" „Скарынія.." Калі прыняць пад увагу апошнія „праказьніцтвы" сяброў „Скарыніі" і іхную паслухмянасьць на ўсё, што наказуе „Бел. Звон," дык абраз бязслаўнай „дзейнасьці" праясьняецца што раз болей і выразьней.

Аб нападзе на Друкарню была паведамлена паліцыя і сьпісаны адпаведны пратакол.

Штандар корпорацыі „Скарынія" на імянінах марш. Пілсудзкага. Што такое корпорацыя „Скарынія",—аб гэтым ужо ўсе беларусы ведаюць. Ведаюць так-жа што корпорацыя „Скарынія" мае штандар, на высьвячэньні якога быў у царкве і „сам" А. Луцкевіч. Але ня ўсе ведаюць, што „Скарынія" з гэтым штандарам была на імянінах марш. Пілсудзкага. Дык вось, хоць і спазьніўшыся крыху, зашто перапрашаем чытачоў „Б. Кр.," „Скарынію" і яе апякуноў, падаём, што корпорацыя „Скарынія" на акадэміі імянін марш. Пілсудзкага 19.III сёл. г. была з поўнай парадай — з сваім штандарам.

Чаму „Скарынія" сама трымае ад беларусоў такія рэчы ў сакрэце? Ці-ж бы „саромілася"?

Na kancy kancoŭ—krynica;
Ŭ joj—cudoŭnaja wadzica:
Letam doždžyk jak idzieć,
Tam wadu wiasiołka pjeć.
Tam świacieńkaja Paraska,
Kali pryjdzie Boža łaska,
Z toj wady, z tumanu, z pary
Tče i tče niabiesny chmary;
Časam močyć ich ŭ krynicy,
Časam sušyć u światlicy,
Ci puskaje prociŭ sonca
Drobnych chmarak wałakonca.

Światy Jury, jak patreba,
Kali tolki jedzie z nieba,
U toj krynicy kania poić,
Myje, čyścić, stroić, zbroić.

A Iłła, dziadok świacieńki,
(Wielmi, wielmi jon stareńki,
Nawiet kryšku hłuchawaty),
Byŭšy ŭ niebie nie zaniaty,
Skolki moh, adtul śpiašaŭsia
I ŭ krynicy toj kupaŭsia.
Woś i Janka tut źlazaje,
Harbuniočka adkiałzaje,
U krynicy hetaj poić,
Pośle myje, čyścić, stroić.
Dyk Kaniok až zaświaciŭsia,
Jak-by ŭnowa naradziŭsia.
Kańka pośle asiadłaje,
Zakiałzaje, dy siadaje,
I pajedzie, jak patreba,
Z ziamli prosta, dyj na nieba.

IV.

Baśnia skorańka placiecca —
Dzieła chutka nie wiadziecca.
Padyjšla jakraz tut chmara,
Dyk Kaniok padskočyŭ zara
I pajšoŭ wyšej, wyšej,
A ziamla nižej, nižej;
Tak źmianšacca wielmi stała,
Až ŭziała saŭsim prapała!
Jeduć, bačać: ŭsio cudoŭna,
A daroha tak čaroŭna,
Što nia znaju, jak skazaci,
Jak u baśni apisaci.
Hladzieŭ Janka, dziwawaŭsia,
Dy bažyŭsia, prysiahaŭsia,
Što takoj nihdzie nia bačyŭ.
I jašče Kańku adznačyŭ,
Što niabiesnaja darožka
Pryhažej čym ichna wioska.
Dalej bačać: staić chata,
A bahata, dyk bahata!
Što takoj nihdzie nia znajdzieš.
Choć sabie, hdzie chočaš zajdzieš:
Moža chto i nie pawiera,
Što tut soncawa kwatera?
Janka dźwiery adčyniaje,
Bačyć — chata załataja!
Wokny świetły, kryštałowy,
Ścieny ŭsie dyjamentowy;
A kruhom usio pryhoža:
Šmarahdowa staić łoža —
Tut woś sonca byŭ prypynak,
Hdzie chadziła na spačynak.
Nachadziŭšysia ad rańnia,
Napacieŭšyś, spracawana,
Kožny wiečar naša sonca
Spać chadziła praz wakonca.
Rana, kryšačku praspaŭšyś,
Z miakkim łožkam raźwitaŭšyś,
Uznoŭ brałaś da raboty —
Ad niadzieli da suboty...
Kali sonca tak pracuje,
Miesiac kryšačku hultuje:
I skradajecca, jak moža,
Palažać na toje łoža,
Što praz noč nahreła sonca.
Dyk woś skraŭšyś praz wakonca,
Jak na łožka ciopła skoča,
Dyk lažyć tam, skolki choča.

V.

Woś Iwan tudy zachodzić
I takuju reč zawodzić:
„Bju pakłon, moj miesiac jasny!
Ja Iwan—chłapiec niaščasny;
Dyk pasłuchaj, budź łaskawy —
Maju ważnyja tut sprawy.
„Dobra, što tam za trywoha,
Ci nia sprawa ducha złoha?"
„Ja z ziamli prynošu wieści."
„Dyk budź hościem, prašu sieści!"
Kaža miesiac. Janku sadzić,
Pa hałoŭcy jaho hładzić:
„Budź spakojny, każy śmieła!"
Janku ŭ sercy palahčeła.
Kaža: „Dobra, ŭsio pryznaju,
Što na sercy tolki maju:
Ja - Iwan, słuha kniaziowy.
Byŭ ja śmieły i hatowy,
Kudy tolki mianie słali.
Dyk woś mnie raz zahadali
Zławić kniaziu Car-carycu,
Twaju krasnuju siastrycu.
Pierabryŭ ja reki, hory
I zławiŭ jaje na mory.
Nie hniawisia, miesiac jasny!
Bačyš—ja chłapiec niaščasny:
Kniaź mnie heta zahadaŭ,
I prykaz mnie wostry daŭ;
I ŭznoŭ nawiet byŭ hatowy,
Kab pasieč mianie na drowy.
Kniaziu chočacca žanicca
Z twajej rodnieńkaj siastrycaj.
Užo stroili wiasielle,
Ŭ cełym zamku było šumna,
Dyj careŭna była sumna...
U tym hory, u tym žalu
Pa mianie skarej pasłali.
Ci kamu wiasielle, swaty—
Ja zaŭsiody winawaty!
Kamu ščaście, ci trywoha,
Ci dalokaja daroha —
Kniaź usiudy mianie pchaje,
Jašče łaje, krepka łaje...
„Jedź!" dy kaža: „nie spračajsia,
A jak nie, dyk raźwitajsia
Z swajej rodnaj haławoju!"
I klaniecca baradoju.
Tut pakłonaŭ nadawali,
Da ciabie jak pasyłali,
I pytali ab zdaroŭje.
Tak-ža inša biezhałoje
Paručali — na dno mora —
A mnie hora, adno hora!..."

Miesiac staŭ Iwana ciešyć;
Kaža: „Kniaź twoj mianie śmiešyć:
Što, ty kažaš, jon bałboča:
Stary chren žanicca choča?

(d. b.)

Да нас пішуць.

ВЫТЛУМАЧЫЎ.

Парафіянава. Аднойчы йшоў я з Даўгінава праз Будслаў дамоў. Па дарозе падвёз мяне грам. З. да Будслава. Угледзіла гэта паліцыя. Здаецца, што-ж тут такое? Але і з гэтага „выцёнгнэла ввёскі". Пан камандант зьвярнуўся да грам. З. і „парадзіў," каб гэткіх небясьпечных людзей, як я, не падвозіў. Давядаўшыся я аб гэтым, запытаў у п. каманданта, чаму я такі „небясьпечны"? На маё запытаньне п. камандант адказаў, што са мною можна гаварыць, бо я належу да „Цэнтрасаюзу", але вось ёсьць шмат такіх, што чытаюць „Бел. Крыніцу" і падчас выбараў лучацца з Украінцамі, дык з тымі і гутаркі няма ніякай. Я толькі падзякаваў п. каманданту за гэтае тлумачэньне, бо гэтым ён выразна даў характарыстыку аб „Цэнтрасаюзе." Цяпер я добра ведаю, што „Цэнтрасаюз" называецца беларускай арганізацыяй толькі таму, каб лепш падыйсьці да беларусаў, а дух гэтай арганізацыі дык польскі.

Падарожны.

ПРАЦА ГУРТКА БЕЛ. ІНСТЫТУТУ ГАСП. І КУЛЬТУРЫ у ЛЯХАВІЧАХ І ПРАВАКАЦЫЯ ЧЫРВОНАЙ ПЛАХТАй.

У ваколіцах Ляхавіч (Баранавіцкі пав.) беларуская народная сьведамасьць даволі моцная. У Ляхавічах ёсьць гурток Б.І.Г.і К. які інтэнсыўна працуе над пашырэньнем беларускай народнай культуры. Апрача шырэньня добрай кніжкі, гурток наш часта ладзіць беларускія прадстаўленьні. У сёлетнім 1932 годзе Лахавіцкі гурток Інстытуту зладзіў прадстаўленьні ў вёсках: Жарабковічы, Канюхі, Зубелявічы, Рачканы, Падлесься, Шавялі, Шчасновічы, Навасёлкі і трэйчы ў р. Малая Лотва.

Зацікаўленьне беларускай сцэнай сярод беларускага сялянства нашай ваколіцы вялікае. Настрой сялян, чыста народніцкі, штораз узрастае.

Не падабаецца гэта відаць нашым ворагам і яны стараюцца, як могуць, гэты настрой здушыць. Вось як выглядае іх работа.

У ночы з 30.IV на 1.V у многіх вёсках нашай Лахавіцкай гміны гэтыя цёмныя сілы параскідалі камуністычныя адозвы. Гэтыя дурнога зьместу адозвы, як заўсёды, падабрала паліцыя, бо сяляне нашы на гэткаю дурнату нават і ўвагі не зварочваюць. Ды няма там на што й глядзець— такая дурната пішацца ў гэтых адозвах, што дзіўна робіцца, як гэта і зможа майстра гэтых праклямацыяў так глупа напісаць. Але ня ў тым справа. А справа вось у чым.

Паліцыя, пабіраючы гэтыя праклямацыі, пазабірала і моладзь, падазраваючы яе ў камунізьме; арыштаваўшы такім чынам маладых хлапцоў з дзьвёх вёсак, Канюхоў і Жарабковічаў, адаслала ў павет, у Баранавічы, дзе і сядзяць пакуль суд ды дзела.

Дык, як бачым, камуністычная работа з дурнымі праклямацыямі і палягае на тым, каб беларускі сьведамы нацыянальна элемэнт пазаганяць у польскія турмы. А ў Польшчы турмаў для беларусаў хапае.

Чай.

СЛУЖЫ ПАНУ ВЕРНЕ А ЁН....

У Баранавіцкім пав. Хіба-ж, як і ва ўсёй Беларусі, здараюцца сярод беларусаў так званыя „панскія падлізы", катрыя з вялікай прыемнасьцяй, за кіўкі панам агрызак, кусаюць сваіх людзей. Але паны трымаюць іх на сваім падворку толькі да тае пары, пакуль яны ім карысны, а як толькі прыкмецяць, што яны ніякай вартасьці для іх ня маюць, адпіхаюць іх ад сябе далей.

У Дараўскай гміне ёсьць кравец, чалавек з першага пагляду і нядурны, а ў Ляхавічах гэткі самы муляр. Яны сьпярша мелі сякі-такі аўтарытэт у сваіх людзей, але вельмі паном прыслужваліся — называлі сябе палякамі. Дык паны пастараліся зрабіць іх войтамі, аднаго ў Дураве, а другога ў Ляхавічах. Але народ гэтых паноў скора пазнаў і ад сябе адкінуў. А паны, бачачы, што яны ўжо бескарысныя прагналі іх ад сябе вон. Так і кончылася іх кар'ера. У Дараве сеў войтам абшарнік, а ў Ляхавічах—асаднік.

Ёсьць яшчэ і другога сорту людзі, каторых раней ці пазьней спаткае такі самы лёс. Вось яны:

Гэтымі днямі спаткаўся я з адным знаёмым шаўцом, маладым хлапцом; ён мне кажа, што належыць да польскага „стоважышэня млодзежы" і што яму абяцалі прыбышы палякі (у нас тутэйшых палякоў амаль саўсім няма) аддаваць усю шаўцоўскую работу. Я ў яго пытаю, — што-б ён рабіў, каб яшчэ некалькі шаўцаў да гэтага „стоважышэня" належала і палякі раздалі гэту работу ўсім па адным боце — ён адказаў, што пакінуў-бы гэта „стоважышэне."

Пара, дарагая маладзяж, пакінуць чужы павадок і трэба закладаць свае гурткі Бел. Інст. Г. і Культуры ды трымацца пагаворкі: „Чым хата багата тым і рада."

Янук Клешч.

ШАНУЙМА НАШУЮ РОДНУЮ МОВУ!

Навагрудак. Ёсьць пэўнікам, што доля Беларуса — доля безпатольная. Спрадвеку носіць ён на сваіх плячох надлюдзкі цяжар гэтага жыцьця. Нямала пагнуўся пад „бурамі" і „вятрамі" ў працягу доўгіх, мінулых вякоў, хаваючы даўнавую крыўду на дне свае душы. Прайшло шмат гадоў. Зьнікнулі з грамадзкай арэны эгоістычныя манархісты — дэспоты і здаецца пара, каб даць раздольле вызьвянай дагэтуль справядлівасьці і здаецца павінна супачыць і збалеўшае цела і душа Беларусі. Але пакульшто справядлівасьць дагэтуль астаецца для Беларуса люксусам, дагэтуль цярпіць ён ня толькі фізычна, але і маральна, калі ўсе яго сьвятасьці выстаўляюцца на зьдзек, калі яго „добрыя" суседзі, замест яго падмацаваць, граюць на яго нэрвах, паніжаючы яго гонар, высьмейваючы яго родную мову, робячы закіды, што гэта мова дзікая, нямаючая прэтэнсыі да назову мовы. І розныя панкі і паўпанкі ўважаюць мову беларускую за нешта новае, што толькі цяпер бязладна пачынае тварыцца бяз ніякіх правілаў і смаку. Доказам гэткіх пагляданў нашых „прыяцеляў" ёсьць спроба тварэньня нейкай monstrum — мовы рэгіёнальнай. Я ад сябе далучаю ніжэй падавае абвяшчэньне, пісанае адным панам вэтэрынарам з „добрай верай", што гэта пабеларуску.

Обяулевіе. Фельчарветеринарій В. Королов с Барановичи с 26-летней практикой, штодзенвіе принимает хворых животных: коней, коров, овец, коз, свиней, собак, котек и птацтво. Вылечиваю нарицы, очищаю огеров до 15 лет без лещотек по цене от 5 зл. (после операція треба стоять 4 часа у мне на дворе), быков, кнуров, самиц свиней. Всегда даю порады: кали не добро телеться, альбо жеребяться. Делаю охвонне щепёнки свиньям от заказных хворсб, як то Червонка, Помур и т. д. Выезжаю на вёску в экстренных случаях. Цена за пораду 2 зл. Выезд 10 зл. м-ко Молчадь, улица 3-го мая № 45 у Солтыса. —З гэтага абвяшчэньня нашыя сяляне мелі вялікую „пацеху." А з гэтага ясна, што Беларусы сваю жывую мову мусяць бараніць ад рускага ці польскага сьмяцьця.

Г.

З фронту маральнага бандытызму.

*

Ведамы на беларускім грунце ў Вільні „вязлец" ад розных цёмных спраў Р. Астроўскі, відаць спаўняючы сваю „службу", сапраўды пабандыцку напаў на ведамага беларускага дзеяча Кс. Ад. Станкевіча ў „Kurjery Wilenskim". Даведваемся, што калі пакрыўджаны зьвярнуўся да таго-ж „Kurjera Wilen.", каб зьмясьціць свой адказ на напад Астроўскага, „Kurjer Wil." зрабіць гэта адмовіўся. З гэтага бачым, як урадавыя польскія кругі абераганюць свайго чалавека.

Адказ аднак Кс. Ад. Станкевіча стаўся грамадзянству ведамы, бо паявіўся ў расейскай газэце „Наше Время" (11.V.1932), адкуль і мы яго бяром і знаёмім з ім беларускае грамадзянства, перадруковываючы яго тут цалком:

„У „Kurjery Wilenskim" з дня 3.V. бяг. г. — піша Кс. Ад. Станкевіч — паказаўся ліст Р. Астроўскага, датычачы маей асобы. У лісьце гэтым Астроўскі, даўшы волю свайму абурэньню (ведама, па загаду. — прып. Рэд.) на „Бел. Крыніцу" з дня 1.V. бяг. г. за артыкул „Немагчыма", у якім гаворыцца, што ён Астроўскі распускаў сярод беларускага грамадзянства чуткі, што быццам школьныя ўлады, з канцом бягучага году, думаюць зьліквідаваць дзьве апошнія беларускія гімназіі ў Навагрудку і ў Вільні, — цалком нечакана той-жа Астроўскі ўсю адказнасьць за гэты артыкул узлажыў на мяне, прыпісваючы мне кіраўніцтва „Бел. Крыніцай" і аднача сна абвіняючы мяне ў „сьведамай злой волі" і ў „палітычнай і грамадзкай амаральнасьці".

Адказваць Астроўскаму на ягоныя адносна мяне інсынуацыі, я ня лічу патрэбным, бо інсынуацыі гэтыя— гэта не канкрэтныя закіды, але цалком галаслоўны і безпадстаўны напад, маючы на мэце даносіць на мяне і мяне чарніць. Адказваць яму я ня лічу так-жа патрэбным і дзеля таго, што напад гэты паходзіць ад асобы з якой гаварыць аб палітычнай і грамадзкай маралі — тое самае, што са сьляпым гаварыць аб колерах. Апрача гэтага асоба Астроўскага як сярод беларускага грамадзянства ўмяркаванага, так і радыкальнага, слыве як лаўкача розных палітычных маскарадаў і інсцэнізацыяў, а не як паважнага і адказнага дзеяча. Праканаўне гэта аб Астроўскім украпілася ў беларускім грамадзянстве асабліва пасьля адыгранай ім дужа няцікавай ролі ў „Грамадзе" і ў Віл. Бел. Гімназіі за часоў яго там дырэктарства, калі ён сьпярша папусьціў моладзь да раскомунізаваньня, а пасьля, зьмяніўшы ор'ентацыю савецкую на польскую, тую-ж моладзь выганяў пры помачы паліцыі, ломячы гэтак маладое жыцьцё гэнай моладзі.

З другога боку я хачу тут сьцьвердзіць, што за рэдакцыю „Бел. Крыніцы" не адказваю, бо даўно ўжо, дзеля агульна ведамых прычын, забарона Арцыбіскупа— прып. Рэд.), у склад рэдакцыйнай калегіі гэтай часопісі ня ўходжу.

Лічу так-жа сваім абавязкам сьцьвердзіць, што на працягу некалькіх апошніх нядзель сярод беларускага грамадзянства хадзілі ўпорыстыя трывожныя чуткі, што школьныя ўлады ў бліжэйшай будучыне думаюць цалком ліквідаваць Бел. Гімназію ў Навагрудку і перадаць у рукі дзяржавы Бел. Гімназію ў Вільні, а на дырэктара назначыць паляка. Чуткі гэтыя — было гэта публічнай тайніцай — паходзілі іменна ад Р. Астроўскага".

Гэткі адказ Кс. А. Станкевіча Астроўскаму спатыкаем у „Нашем Времени". Сапраўды шмат ён кідае сьвятла на асобу гэнага махера, які сваей „работай" так страшна шкодзіць беларускай школе і дэмаралізуе нашу моладзь.

*

Галава ад палітычных афэраў, ведамы ў беларускім грамадзянстве як „Сьмердзяков" Антон Луцкевіч, прышоўшы на зьмену Аляксюку, Пацлюкевічу, Валэйшу і Вярнікоўскаму, выдае орган польска-беларускай угоды „Бел. Звон", у якім даволі часта, прыкладна спаўняе роль Сьмердзякова, раскладаючы беларускую народную працу. Але грамадзянства беларускае ды й народ беларускі ўжо даволі пазнаўся на гэтым гадзенькім чалавечку, пакінуў яго на баку і пашоў сваей адраджэнскай дарогай. Дык вось гэта найбольш Луцкевіча гневае і дражне, бо пры гэткіх варунках для яго няма гешэфту.

У „Бел. Звоне" (13.V.1932) ён натужвае ўсе свае сілы і пад шумным загалоўкам „На ўсенародны Суд" нападае на БХД і „Бел. Крыніцу" спосабам годным сябе, прыпісваючы нам усё тое, што ён сам у беларускім жыцьці заўсёды рабіў і робіць. Але іменна гэны ўсенародны беларускі Суд інакш судзе і ўжо асудзіў Луцкевіча на ўсей лініі. Знае яго Беларусь Усходняя і Заходняя, бо-ж усім ведама, што апіраючыся на пануючую ўладу і запрокшыся нават беларускага народу (Луцкевіч назваў сябе „беларус-паляк"), народ беларускі вывесьці на волю нельга.

Ну, але яму, Л-чу, так рабіць відаць, аплачваецца. На шчасьце аднак ў Беларусаў, што да яго асобы, няма ўжо наіўных. Вечным масонскім круцельствам і ілжой можна далёка зайсьці, але нельга назад вярнуцца.

—j—

Гутарка Дзядзкі Гаўрылы.

Па цяжкой працы трэба і аддыхнуць, а каб воддых ня быў звычайным ляжаньнем і больш прыемны, трэба ладзіць супольныя гульні, гэта зн. прадстаўленьні ў роднай беларускай мове; а пасьля прадстаўленьня—супольныя вечарыны з скокамі.

Калі прад кожнай вечарынкай будзе адыграны хоць малы сцэнічны твор, дык і старэйшыя будуць мець магчымасьць правесьці карысна час у вольную часіну. Прадстаўленьне зрабіць ня цяжка. Патрэба 6—10 асоб ахвочай моладзі. Як няма ў вёсцы арганізацыі, дык ўваход зрабіць бясплатны, дзеля гэтага трэба падабраць штуку да граньня, гдзе спэцыяльных касьцюмаў ня трэба.

Каб мець грошы на пакрыцьцё выдаткаў, трэба рабіць ўваход платны, а каб пачаць гэту працу, трэба залажыць Гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, бо прыватным асобам дазволу на прадстаўленьне не ахвотна даюць.

Гэты малы высілак дасьць вам прыемную і карысную разрыўку.

Дык да працы моладзь! Ды і вы, дзяўчаткі, ня чурайцеся і бярыцеся за працу!

Аб працы ў гэтым кірунку зварачывайцеся з запытаньнямі да Рэд. „Бел. Крыніцы" і „Шляху Мол.", каторыя з ахвотай даваць вам будуць парады.

Дзядзька Гаўрыла.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.